# Год добраўпарадкавання

У бібліятэках Шчучынскага раёна працягваецца работа ў рамках Года добраупарадкавання.



**20 красавіка** ў філіяле "Тур'янская сельская бібліятэка" прайшла гутарка-дыялог "Добраўпарадкаванне – шлях да камфортнага жыцця". У ходзе мерапрыемства асаблівая ўвага была ўдзелена пытанням развіцця і добраўпарадкавання нашага раёна, сваёй мясцовасці і свайго двара. Абмяркоўвалі, які ўклад кожны з нас можа ўнесці ў гэтую справу.

**26 мая** супрацоўнік філіяла "Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава" правяла завочнае падарожжа "Прагулкі па абноўленай Беларусі". Удзельнікі ўбачылі кніжную выставу "Добраўпарадкаванне і якасць жыцця", азнаёміліся з Указам № 1 аб аб'яўленні Года добраўпарадкавання і даведаліся пра дасягненні і славутасці Беларусі з дапамогай электроннай прэзентацыі.

# Да 80-годдзя Перамогі Вялікай Айчыннай вайны



Шмат гадоў прайшло з дня Вялікай Перамогі, але мы і цяпер можам уявіць сабе, як шмат значыў гэты дзень для нашых дзядоў і прадзедаў. Памяць пра вайну 1941-1945 года захоўваецца ў людскіх сэрцах і перадаецца з пакалення ў пакаленне.

**9 красавіка** ў філіяле «Астрынская гарпасялковая бібліятэка» сумесна з педагогам дадатковай адукацыі Цэнтра вольнага часу "Спадчына" прайшла інфарміна «Воінскія пахаванні на тэрыторыі Астрына», прысвечаная 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Дзеці даведаліся пра помнікі пасёлка: Воіну-вызваліцелю, перапахаваным салдатам і брацкай магіле камсамольцаў-падпольшчыкаў. Мерапрыемства нагадала аб значнасці памяці і павагі да герояў.

**25 красавіка** Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі прыняла ўдзел у Міжнароднай культурна-асветніцкай акцыі ў падтрымку чытання – “Бібліяноч-2025”! Госці сабраліся на франтавы прывал "Гукі памяці" і адправіліся ў музычнае падарожжа "Як песня дапамагала перамагаць: 10 песень ваенных гадоў". Гучалі вершы аўтараў-франтавікоў, ваенныя песні ў выкананні агітбрыгады ДУК "Шчучынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці". Прайшоў воркшоп па стварэнні франтавых лістоў: даведаліся, як франтавыя лісты ўплывалі на жыццё салдат і іх блізкіх, навучыліся пісаць лісты ў стылі той эпохі. На

працягу ўсяго мерапрыемства ўдзельнікі пакідалі на "Сцяне ўспамінаў" запісы аб тым, што для іх значыць памяць аб вайне.

**2 мая** ў філіяле "Астрынская гарпасялковая бібліятэка" прайшоў патрыятычны дыялог "Паклон Вам нізкі за Перамогу". Размова з дзецьмі ішла аб важнасці захавання памяці, пошукавай працы і правільным разуменні сучаснай сітуацыі. Гучалі вершы па тэме, рабяты паглядзелі прэзентацыю. Усе разам запалілі свечкі ў памяць аб нашых загінулых земляках і ўсталявалі іх у фота зоне. Пазнаёміліся ўдзельнікі з выставай літаратуры «...І зноў гартаючы ваенныя старонкі».

**5 мая** прайшла гістарычная хроніка "У сэрцах і кнігах памяць аб вайне", якая дазволіла хлопцам і



дзяўчынкам з Сярэдняй школы № 1 у віртуальным фармаце даведацца пра ключавыя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Адмысловую ўвагу надалі мемарыяльным комплексам: "Музей.Землянка" у в. Зачэпічы, "Зінякі" і "Хатынь". Таксама школьнікі наведалі музейны пакой СССР, дзе спецыяліст ДУК "Шчучынскі РЦКіНТ" расказаў пра генацыд беларускага народа і лагеры смерці.

**6 мая** ў філіяле "Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава" прайшла тэматычная сустрэча "Жыць у кароткім слове "ПАМЯЦЬ"...". Бібліятэкар раскказала прысутным пра цяжкія выпрабаванні, якія выпалі на долю нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, пра тыя далёкія і цяжкія дні, пра гераічныя подзвігі



землякоў, якія не шкадуючы сіл набліжалі доўгачаканую Перамогу. Для ўдзельнікаў мерапрыемства былі паказаны відэаролікі, гучалі музычныя творы  і вершы пра вайну. Напрыканцы мерапрыемства ўсе запусцілі голуба - сімвал міру.

**7 мая** ў філіяле "Астрынская гарпасялковая бібліятэка" прайшоў марафон ваеннай кнігі "І зноў гартаючы ваенныя старонкі..." Вядучыя займальна распавялі пра свята Вялікай Перамогі, падкрэсліўшы значнасць памяці пра тыя страшныя дні і герояў, якія аддалі свае жыцці ў барацьбе з фашызмам.

**8 мая** ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі прайшоў Дзень патрыятычнай кнігі "Кніжным радком аб вайне". Дзеці пазнаёміліся з творчасцю аўтараў-франтавікоў, пачулі іх натхняльныя гісторыі і перажыванні. Быў арганізаваны прагляд буктрэйлераў,

якія апускалі ў атмасферу ваеннага часу. Напрыканцы мерапрыемства дзеці ўшанавалі памяць воінаў хвілінай маўчання, выказваючы павагу і падзяку тым, хто змагаўся за нашу свабоду.




**9 мая** ДУК "Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі" у гарадскім скверы арганізавала літаратурны фронт "Была вайна, была Перамога". Госці акунуліся ў атмасферу ваенных гадоў дзякуючы фотазоне «Ваенныя старонкі» з архіўнымі здымкамі і кнігамі. Юных наведвальнікаў чакала інтэрактыўная зона «Вясёлка памяці» з гульнямі, майстар-класамі і творчай майстэрні. Асаблівую ўвагу прыцягнулі праекты «Кніга Перамогі» і «Крокі да Перамогі». Мерапрыемства стала важным крокам у захаванні гістарычнай памяці і выхаванні патрыятызму.

## Да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыда беларускага народа

**11 чэрвеня** бібліятэкары Астрынскай гарпасялковай бібліятэкі распачалі цыкл мерапрыемстваў вахты памяці да дня пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Падарожжа ў Астрыно "За мірнае



неба дзякуй героям" было прысвечана першым дням вайны ў Астрыне і засноўвалася на ўспамінах старажылаў, сабраных клубам «Спадчына». Дзеці даведаліся аб з'яўленні фашыстаў у пасёлку, стральбе за хлебам і аб тым, як людзі хаваліся ў дварах. Тэма аказалася сур'ёзнай, і дыялог выклікаў успаміны пра апавяданні дзядуляў і бабуль. Некаторыя факты былі новымі і ўзбагацілі гістарычныя матэрыялы бібліятэкі.

**17 чэрвеня** Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі правяла хранограф мужнасці "Нам даверана памяць". Першая частка выставы асвятліла першы дзень вайны і мужнасць салдат. Другая частка «Рэха чэрвеня 41-га» ўключала песні і вершы франтавікоў. Мерапрыемства завяршылася хвілінай маўчання, падкрэсліўшы важнасць памяці аб гераізме тых дзён.

**23 чэрвеня** ў філіяле "Шчучынская дзіцячая бібліятэка" прайшоў урок-рэквіем "Памяць мацнейшая за час". Удзельнікам нагадалі аб вераломным нападзе фашысцкай Германіі на нашу краіну і жахах, якія перажылі людзі. Дзеці даведаліся пра гераічных абаронцаў



Брэсцкай крэпасці, подзвігі партызан і лёс Хатыні. З цікавасцю слухалі ветэрана Узброеных Сіл, воіна-інтэрнацыяналіста, задаючы яму пытанні.

Франтавая бібліятэка курсіруе па Шчучынскім раёне: Дзень памяці і смутку "Вяртаюся памяццю да вайны" праведзены супрацоўнікамі бібліятэкі для жыхароў аграгарадка "Руткевічы". Бібліятэкар паспрабавала данесці да людзей важнасць памяці аб вайне і яе героях. Кожны год, у Дзень памяці і смутку, мы ўзгадваем падзеі Вялікай Айчыннай вайны і тых, хто аддаў свае жыцці дзеля свабоды і міру.

## Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі

**2 красавіка** ў філіяле "Астрынская гарпасялковая бібліятэка" прайшоў патрыятычны дыялог "Дзве мовы сталі блізкімі мне змалку", прысвечаны Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, была падрыхтавана цікавая прэзентацыя. Дзеці даведаліся пра шмат гістарычных фактаў аб Дагаворы і аб тым, як ён уплывае на нашы краіны сёння. У завяршэнне адбыўся агляд літаратуры, прадстаўленай на выставе.

## Дзень Чарнобыльскай трагедыі

**24 красавіка**, у Дзень Чарнобыльскай трагедыі, у філіяле "Шчучынская дзіцячая бібліятэка" адбыўся дыялог "Чорная дата календара" з навучэнцамі 5 класа Сярэдняй школы №1 г. Шчучына. Падчас размовы абмяркоўваліся падзеі выбуху на Чарнобыльскай АЭС

і яго наступствы. Дзеці азнаёміліся з фактамі таго дня і аднавілі паслядоўнасць падзеяў. У выніковай выснове навучэнцы адзначылі, што адказнае стаўленне да ядзернай энергіі робіць мірны атам саюзнікам, а не ворагам.

У філіяле "Астрынская гарпасялковая бібліятэка" прайшла гадзіна памяці "Белы бусел - чорны цень" аб катастрофе на Чарнобыльскай АЭС. Бібліятэкары распавялі пра станцыю, горад Прыпяць, выкарыстаўшы фатаграфіі і вершы. Асаблівую ўвагу надалі ліквідатарам, сярод якіх былі землякі. Дзеці запалілі свечкі памяці ля фатаграфій загінулых пажарнікаў і ўшанавалі іх хвілінай маўчання.

**30 красавіка** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава” адбыўся экалагічны рэпартаж “Вечнае эха Чарнобыля”, дзе ўдзельнікі даведаліся пра прычыны і наступствы аварыі і наведалі кніжную выставу.



**30 красавіка** ў філіяле “Бакштаўская сельская бібліятэка” прайшоў круглы стол “Чарнобыль у нашай памяці”, на якім абмяркоўваліся падзеі 1986 года і іх уплыў на жыццё людзей.



**30 красавіка** філіял “Васілішкаўская сельская бібліятэка” правёў час разважання “Чарнобыльская трагедыя вачыма вашых аднагодкаў”, дзе ўдзельнікі паглядзелі ролік пра трагедыю і абмеркавалі яе наступствы.

## Здаровы лад жыцця

Здароўе - гэта самае цэннае, што ёсць у чалавека.

**17 мая** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава” прайшоў слайд-рэпартаж “СНІД – чатыры літары – мільён жыццяў”, прымеркаваны да Сусветнага дня памяці ахвяр СНІДу. Удзельнікі даведаліся пра гісторыю хваробы, шляхі перадачы ВІЧ і спосабы прадухілення заражэння. У канцы мерапрыемства ўсе атрымалі буклеты «Праяві клопат пра сябе і сваіх блізкіх» і азнаёміліся з выставай «Здароўе для ўсіх». Мерапрыемства суправаджалася відэапрэзентацыяй аб знакамітасцях, якія жывуць з ВІЧ, і тых, хто памёр ад СНІДу.

## *Сусветны дзень здароўя*



**3 красавіка** філіял "Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка" запрасіў навучэнцаў на пазнавальны

квэст "Компас у краіну здароўя". Дзеці пры дапамозе «Паравозіка з Рамашкава» здзейснілі вандраванне па Краіне Здароўя, дзе на кожным прыпынку выконвалі заданні, якія нагадваюць аб здаровым ладзе жыцця, правілах гігіены і неабходнасці займацца фізкультурай і спортам. Для дзяцей была аформлена кніжная выстаўка "Стыль жыцця - здароўе".

**4 красавіка** ў Шчучынскай бібліятэцы імя Цёткі прайшла тэматычная гадзіна "У краіне здароўя і прыгажосці". Гасцямі былі ўрач-эпідэміёлаг і старшыня Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа. Удзельнікі даведаліся пра здаровы лад жыцця, звычкі і прафілактыку інфекцыйных захворванняў. Гутарка суправаджалася прэзентацыяй "Акадэмія здароўя" і аглядам выставы "Новаму стагоддзю - здаровае пакаленне".

У рамках Сусветнага дня здароўя, які адзначаецца **7 красавіка**, некалькі бібліятэк раёна правялі мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне дасведчанасці аб здароўі і здаровым ладзе жыцця. Бібліятэкары сумесна з удзельнікамі абмяркоўвалі важнасць здароўя, гармоніі ў адносінах, спалучэння працы і адпачынку, здаровага харчавання, фізічнай актыўнасці і адмовы ад шкодных звычак. Гэтыя мерапрыемствы садзейнічалі павышэнню цікавасці да пытанняў здароўя і прадаставілі ўдзельнікам карысныя веды аб тым, як клапаціцца аб сваім здароўі.

**10 красавіка** ў філіяле "Шчучынская дзіцячая бібліятэка" прайшло захапляльнае мерапрыемства да Сусветнага дня здароўя — інфармацыйнае дасье "Крокі да здароўя". Удзельнікі даведаліся аб асновах

здаровага ладу жыцця, склалі ідэальны рэжым дня школьніка і з "чароўнай" каробкі даставалі прадметы асабістай гігіены, што дадало элемент гульні. У завяршэнне дзеці стварылі сваё дрэва здароўя, тым самым замацаваўшы важныя веды аб здароўі і дабрабыце.

## Да Дня Дзяржаўнага флага, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь

**10 мая** ў філіяле "Тур'янская сельская бібліятэка" прайшоў экскурс "Слаўныя сімвалы нашай Айчыны". Бібліятэкар расказала пра сімвалы краіны, іх значэнне і важнасць беражлівых адносін да іх. Дзеці даведаліся пра колеры сцяга і арнамент герба, а таксама пра паводзіны пры выкананні гімна.

У гэты ж дзень філіял "Жалудокская гарпасялковая бібліятэка" правяла відэалекторый "Сімвалы, якімі ганарымся!". Юныя наведвальнікі пазнаёміліся з гісторыяй сімвалаў і прагледзелі відэаролік "Сімвалы маёй краіны". Мерапрыемства дапамагло раскрыць значнасць буслоў, зуброў, Белавежскай пушчы і іншых сімвалаў, якія робяць Беларусь вядомай усяму свету.

**10 мая** ў філіяле «Астрынская гарпасялковая бібліятэка» прайшла гадзіна сапраўднага грамадзяніна «Нашы герб, сцяг і гімн — гэта сімвалы свабоды», прымеркаваны да Дня дзяржаўных герба, сцяга і гімна Рэспублікі Беларусь. Аповяд пра гісторыю сімвалаў нашай краіны саправаджаўся вершамі і музыкай.

Гучалі запісы песень пра Беларусь. Дзеці дзяліліся сваімі ведамі па тэме, якія атрымалі ў школе і ў Інтэрнеце.

## Міжнародны дзень абароны дзяцей

**1 чэрвеня** на абласным фестывалі кнігі "Гродзенскі ЛітФэст", бібліятэкі Шчучыншчыны арганізавалі літаратурны востраў "Свет дзяцінства - самы лепшы свет". Гасцям і жыхарам горада Гродна былі прадстаўлены кніжныя выставы з любімымі выданнямі для дзяцей. Для хлопчыкаў і дзяўчынак былі падрыхтаваны займальныя гульні: крыжыкі-нулікі, мега шашкі, кетчбол, твістэр і настольная рыбалка. Фотазона з кніжнымі інсталяцыямі дала магчымасць зрабіць яркія здымкі і захаваць незабыўныя ўражанні.



**1 чэрвеня** ў бібліятэчных установах Шчучыншчыны прайшлі яркія і запамінальныя мерапрыемствы, прысвечаныя Міжнароднаму дню абароны дзяцей. Гэты дзень стаў сапраўдным святам для дзяцей, напоўненым смехам, радасцю і захапляльнымі актыўнасцямі. У кожным філіяле былі арганізаваны розныя праграмы, якія дапамаглі дзецям праявіць свае творчыя здольнасці і развіць навыкі. Удзельнікі прымалі ўдзел у конкурсах, віктарынах і

гульнях, што садзейнічала не толькі забаве, але і навучанню.

**3 чэрвеня** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава” прайшло гульнявое асарці “Няхай дзяцінства звонкае смяецца!”. Дзеці пачалі з гульні «Прывітанне» і адправіліся ў Краіну Дзяцінства на сме-хо-ле-це. Яны наведалі станцыі:

Апладысменты

Гульнявая

Да ці Не

Хлапчукі і дзяўчынкі

Пытанне-адказ

На кожнай станцыі ўдзельнікі адказвалі на пытанні, разгадвалі загадкі і ўзгадвалі любімыя фразы з кніг. У завяршэнне свята кожны выбраў кнігу з падборкі «Кніжкі ў кепачках і кніжкі ў банціках».

**4 чэрвеня** ў філіяле "Бакштаўская сельская бібліятэка" прайшла забаўляльная праграма "Бесклапотныя канікулы" для дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Праграма мерапрыемства была напоўнена вясёлымі гульнямі, займальнымі конкурсамі. Дзеці з задавальненнем прымалі ўдзел у спартыўных



конкурсах і атрымалі салодкія падарункі.

## Міжнародны дзень сям’і

Да Дня сям'і бібліятэкі раёна праводзілі разнастайныя мерапрыемствы, прысвечаныя важнасці сямейных каштоўнасцей і традыцый.

**13 мая** ў філіяле "Жалудокская гарпасялковая бібліятэка" прайшло пасяджэнне аматарскага аб'яднання "Наш край" пад назвай "Зазірніце ў сямейны альбом". Удзельнікі прынеслі свае даўно забытыя сямейныя фотаальбомы і фатаграфіі, на якіх адлюстраваны родныя, сябры і важныя падзеі з жыцця.

**13 мая** ў філіяле “Тур'янская сельская бібліятэка” прайшла гадзіна разваг “У Міжнародны дзень сям'і я шчасцем падзялюся з людзьмі”. Бібліятэкар расказала пра гісторыю свята і пра значэнне сям'і ў жыцці кожнага чалавека. Прысутныя актыўна ўдзельнічалі ў конкурсах на лепшае выкананне вершаў і песень аб сям'і, успаміналі народныя прыказкі і разгадвалі загадкі.

**15 мая** ў філіяле “Ракавіцкая сельская бібліятэка” адбылася гадзіна сямейных адносін



“Сям'я, сагрэтая любоўю”. Удзельнікі дзяліліся гісторыямі аб сваіх сем'ях, чыталі вершы і ўспаміналі прыказкі аб сям'і.

**15 мая** ў філіяле “Васілішкаўская сельская бібліятэка” прайшла гадзіна сямейнага адпачынку “Мы сям'я, а гэта значыць – справімся з любой задачай” з сям'ёй Мешчараковых, якая святкуе залатое вяселле. Удзельнікі даведаліся пра сямейныя традыцыі, удзельнічалі ў віктарыне і напісалі, за што любяць сваіх бацькоў.

**15 мая** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава” прайшлі бібліятэчныя парады “Што патрэбна, каб жыць дружна”. Гэтае мерапрыемства стала выдатнай магчымасцю для абмену досведам і атрымання новых ведаў аб тым, як зрабіць сваю сям'ю больш шчаслівай.

У філіяле "Астрынская гарпасялковая бібліятэка" адбылося захапляльнае мерапрыемства, прысвечанае Міжнароднаму дню сям'і. Удзельнікі абмяркоўвалі не толькі важнасць і каштоўнасць сям'і, але і ўнікальныя сямейныя традыцыі, якія робяць кожную сям'ю асаблівай. Кожны меў магчымасць падзяліцца сваёй гісторыяй стварэння сям'і і раскрыць сакрэты яе даўгалецця. Акрамя таго, усе змаглі паўдзельнічаць у захапляльных конкурсах і пазмагацца за выдатныя прызы.

**19 мая** ў філіяле "Шчучынская дзіцячая бібліятэка" прайшло пасяджэнне аматарскага аб'яднання "Свет цудаў" да Дня сям'і пад назвай "Сям'і цудоўнае святло". Падчас сустрэчы дзеці абмеркавалі важнасць сям'і і яе ролю ў жыцці кожнага чалавека.

Удзельнікі мерапрыемства сабралі "дом" з цаглінак, якія сімвалізуюць асновы любой сям'і: павага, паразуменне, узаемавыручку, дабрыню і іншыя каштоўнасці.

## Літаратурныя юбілеі

У Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі адбылося пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні “Ад усёй душы” пад назвай “Калі Муза прыходзіць без попыту”. Адной з гасцей стала наша зямлячка М. А. Арлова. Удзельнікі мерапрыемства змаглі зазірнуць у яе творчасць, даведацца, калі прыходзіць натхненне, і навучыцца бачыць звыклае і незаўважнае ў жыццёвых гісторыях. Таксама прагучала музычная сюіта, прапанаваная Генадзем Аляксеевічам Панавым на яе вершы, і былі пачутыя мелодыі з яго зборнікаў “Малая Радзіма” і “Пяшчота душы”.



*да 220-гадовага юбілею з дня нараджэння Г. Х. Андэрсана*

**3 красавіка** ў філіяле “Васілішкаўская сельская бібліятэка” адбылося літаратурнае знаёмства “Юбілей

любімага казачніка”. Хлопцы і дзяўчынкі даведаліся пра цікавыя факты з біяграфіі Ганса Хрысціяна Андэрсана, пазнаёміліся з кніжнай выставай «Казкі на ўсе часы». Падарожнічаючы па казках, дзеці адгадвалі загадкі, па карцінках вызначалі, да якой казкі адносіцца дадзены герой, і інсцэніравалі казку «Дзюймовачка».

**3 красавіка** бібліятэкары філіяла "Астрынская гарпасялковая бібліятэка" правялі ўрок у Народным музеі "Няхай кнігі сябрамі прыходзяць да вас!", прымеркаваны да Міжнароднага дня дзіцячай кнігі. Дзеці даведаліся пра свята і пазнаёміліся з творамі Г.К. Андэрсана. Хлопцы і дзяўчынкі з цікавасцю гарталі кнігі і разглядалі ілюстрацыі.

**6 красавіка** ў філіяле "Навадворская сельская бібліятэка" юныя чытачы адправіліся ў літаратурнае падарожжа "Падарожжа па казках Г.Х. Андэрсана". Дзеці пазнаёміліся з творчасцю казачніка і ўдзельнічалі ў конкурсах: "Уважлівы чытач", "Угадай казку" і "Загадкі". Дзеці выявілі сябе сапраўднымі знаўцамі казак.




**21 красавіка** ў філіяле "Шчучынская дзіцячая бібліятэка" прайшло пасяджэнне аматарскага

аб'яднання "Свет цудаў" "Жыў быў казачнік". Для хлопцаў і дзяўчынак былі падрыхтаваны тэматычныя віктарыны і гульні, якія дапамаглі пазнаёміцца з творчасцю казачніка Г.Х. Андэрсана. Асаблівы энтузіязм выклікалі пазлы па матывах казак пісьменніка «Дзюймовачка» і «Снежная каралева».

*да 90-годдзя з дня нараджэння Р. І. Барадуліна*

**5 красавіка** ў філіяле “Астрынская гарпасялковая бібліятэка” прайшоў бенефіс беларускай кнігі “Чараўнік паэтычнай стыхіі”, прысвечаны творчасці Р. Барадуліна для дзяцей. У гэтым годзе Народнаму паэту споўнілася б 90 гадоў. Бібліятэкар расказала пра яго біяграфію, сям'ю і вершы для дачкі і ўнучкі, дапоўніўшы аповяд яго творамі і загадкамі. Маленькія чытачы з задавальненнем разгадвалі загадкі і задавалі пытанні - як сур'ёзныя, так і смешныя.

***да 60-годдзя выпуску І.Шамякіна “Трывожнае ўчасце”***

**18 красавіка** Шчучынская раённая бібліятэка Цёткі правяла пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні “Партрэт адной кнігі”. Удзельнікі гасцёўні разам з героямі рамана вырашалі праблемныя сітуацыі, якія для іх падрыхтаваў на старонках кнігі Іван Шамякін. Таму і змаглі ўсе разам вымераць глыбіню вернасці і адданасці, шчырасці і сумленнасці, зразумець, з чаго складаецца шчасце ўласнае і

шчаслівая будучыня Радзімы. Заставалася толькі кожнаму дадумаць, што са свайго асабістага змог даверыць чытачам аўтар.

**16 мая** ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі прайшло пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні “Ад усёй душы”: “Жыццё скрозь песенныя радкі”, прысвечанае юбілеям паэтаў М. Ісакоўскага, Я. Далматоўскага і спевака Л. Уцёсава. Удзельнікі сустрэчы дакрануліся да творчага лёсу гэтых выдатных людзей, чые насычаныя біяграфіі натхняюць і сёння. Сустрэча атрымалася цёплай і напоўненай добрай якасцю і верай.

## Фарміраванне інфармацыйнай культуры

Урокі інфармацыйнай культуры ў бібліятэчных установах - работа, якая ставіць сваёй мэтай выхаванне інфармацыйнай культуры сярод навучэнцаў, фарміраванне навыкаў працы з інфармацыяй і дапамогу ва ўжыванні гэтых уменняў на практыцы.

**16 красавіка** ў ААТ "Орля" прайшоў выязны дзень інфармацыі, арганізаваны бібліятэкарам філіяла "Ракавіцкая сельская бібліятэка". Работнікі актыўна абменьваліся кнігамі і часопісамі. Увазе супрацоўнікаў былі прадстаўлены кнігі, такія як «Генацыд беларускага народа. Карныя аперацыі» і «Генацыд беларускага народа», якія застаюцца актуальнымі ў наш час. Таксама была прадстаўлена новая серыя кніг «Жаночыя лёсы».

**22 красавіка** ва УП "ШчучынСпецПашыў" прайшоў выязны дзень інфармацыі "Галерэя кніжных навінак". Супрацоўнікі Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі пазнаёмілі работнікаў прадпрыемства з кнігай “Наш Прэзідэнт”. Падчас мерапрыемства прысутныя таксама маглі азнаёміцца з кніжнымі і перыядычнымі выданнямі з фонду бібліятэкі, што садзейнічала папулярызацыі чытання і пашырэнню кругагляду супрацоўнікаў прадпрыемства.




**24 чэрвеня** супрацоўнікі Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі наведалі Шчучынскі філіял ААТ "Малочны свет" з выязным днём інфармацыі «Чалавек, які чытае, чалавек паспяховы». Работнікі прадпрыемства пазнаёміліся з навінкамі літаратуры з фонду бібліятэкі. Кожны знайшоў для сябе карыснае і цікавае. Пакінулі заяўкі на кнігі, супрацоўніцтва з прадпрыемствам працягваецца.

**26 чэрвеня** бібліятэкары філіяла “Жалудокская гарпасялковая бібліятэка” наведалі УАЗ “Жалудокская гарпасялковая бальніца” з выязным днём інфармацыі “Сузор'е новых кніг”. Працоўнаму калектыву прадставілі навінкі мастацкай літаратуры і перыёдыкі. Да 80-годдзя Вялікай Перамогі былі прадстаўлены

кнігі сацыяльна значнай літаратуры з серыі “Генацыд беларускага народа”, “Каральныя аперацыі”, “80 фактаў аб Вялікай Перамозе”, “Партызаны Беларусі”, а таксама быў зроблены агляд кнігі “Зроблена у Беларусі. Знак якасці”.

## Арганізацыя летняга часу дзяцей і моладзі

Пад час летніх канікул бібліятэкі імкнуцца арганізаваць вольны час дзяцей. Для гэтага праводзіцца мноства мерапрыемстваў. Калі лета на двары, проста нельга заставацца дома**.**

Ужо на працягу многіх гадоў, з надыходам летніх канікулаў, каля філіяла «Шчучынская дзіцячая бібліятэка» кожны чацвер працуе адкрытая чытальная зала. **5 чэрвеня**, пачала сваю працу бібліялужайка “Летнія прыгоды разам з кнігай”. Дзеці з цікавасцю чыталі новую пазнавальную літаратуру і цікавыя часопісы. Аматары актыўнага адпачынку малявалі крэйдамі, гулялі ў настольныя гульні і атрымлівалі асалоду.

**8 чэрвеня** ў філіяле “Ракавіцкая сельская бібліятэка” прайшоў урок паводзін “Мае бяспечныя канікулы”. Лета - час адпачынку, але важна ведаць правілы бяспекі ў экстрэмальных сітуацыях. Дзеці ўспомнілі правілы дарожнага руху, бо строгае выкананне законаў вуліц беражэ жыццё. Удзельнікі ўдзельнічалі ў конкурсах "Пажарная бяспека" і "Загадкавыя знакі", а таксама ў гульні "Што хочаце - гаварыце", абнавіўшы свае веды аб правілах

дарожнага руху. Таксама пазнаёміліся з літаратурай па гэтай тэме.

**10 чэрвеня** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава” прайшоў віртуальны вояж “Журнальная проза і паэзія сёння” для дзяцей з прышкольнага лагера “Вясёлка”. Бібліятэкар пазнаёміла дзяцей з новымі і цікавымі перыядычнымі выданнямі, падарожнічаючы па інтэрнэт-сайтах, часопісаў і газет. Хлопцы і дзяўчынкі даведаліся, як іх аднагодкі пішуць займальныя вершы і прозу, а таксама дзе яны могуць апублікаваць свае работы.



**12 чэрвеня** ў філіяле "Каменская інтэграваная бібліятэка" прайшла біблія-карусель "Стартуем у лета" для выхаванцаў прышкольнага лагера! Удзельнікі наведалі кніжныя станцыі, удзельнічалі ў літаратурных гульнях і творчых майстар-класах. Мерапрыемства стварыла пазітыўную атмасферу і натхніла дзяцей на чытанне ў летнія канікулы.

**12 чэрвеня** ў філіяле “Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава” для дзяцей з прышкольнага лагера “Вясёлка” прайшла гадзіна вясёлых задум “Новыя прыгоды кніжных сяброў”. Мерапрыемства прайшло ў гульнявой форме, дзе ўдзельнікі падзяліліся на дзве каманды і ўдзельнічалі ў

літаратурных конкурсах. Хлопцы і дзяўчынкі атрымалі масу станоўчых эмоцый і ўражанняў.

**12 чэрвеня** філіял “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” наведалі выхаванцы школьнага лагера ДУА “Васілішкаўская СШ”. Для дзяцей была арганізавана азнаямленчая экскурсія па бібліятэцы "У госці да кніг". Дзеці пазнаёміліся з фондам дзіцячых кніг і перыядычнымі выданнямі для іх узросту. Цікавасць выклікала літаратура серыі кніг "Маленькі прафесар" і "Дзіцячая энцыклапедыя".

**12 чэрвеня** бібліятэкар філіяла “Жалудокская гарпасялковая бібліятэка” правяла краязнаўчую экспедыцыю “Цікавае пра край, у якім ты жывеш” для дзяцей з прышкольнага лагера “Новая хваля”. Удзельнікі здзейснілі невялікае падарожжа, прысвечанае роднаму краю, пазнаёміліся з яго гісторыяй і імёнамі людзей, якія праславілі наш пасёлак. Дзецям паказалі прэзентацыю “Старонкамі роднага краю”. У канцы мерапрыемства прайшла экскурсія па памятных мясцінах Жалудка.

**15 чэрвеня** філіял "Навадворская сельская бібліятэка" сабраў сваіх юных чытачоў на мультсалон "Як кніжка фільмам стала і на экран патрапіла". Мультсалон быў прысвечаны кнігам і мультфільмам пра сонейка. Дзеці пазнаёміліся з апавяданнямі і казкамі пра сонейка, змайстравалі вясёлыя сонейкі з паперы. Таксама паглядзелі мультфільм «Як ільвяня і чарапаха спявалі песню». Гэта быў незабыўны дзень, напоўнены радасцю і творчасцю!

**16 чэрвеня** ў філіяле "Шчучынская дзіцячая бібліятэка" прайшло пасяджэнне аматарскага аб'яднання "Свет цудаў" пад назвай "Фарбы лета". Падчас



мерапрыемства дзеці адгадвалі загадкі, удзельнічалі ў казачнай віктарыне, конкурсе малюнкаў і гульні «Папраў памылку». Гэта быў займальны і пазнавальны час, поўны весялосці і творчасці!

**17 чэрвеня** бібліятэкар філіяла "Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Дэмбрава" запрасіла рабятаў з прышкольнага лагера "Вясёлка" на паштовы дыліжанс "Лепшы сябар – "Непаседа", дзе разам адправіліся ў захапляльнае падарожжа ў свет ведаў, гульняў і забаў. Падчас мерапрыемства хлопчыкі і дзяўчынкі чыталі коміксы, разгадвалі крыжаванкі, рэбусы і галаваломкі, а таксама рабілі цацку-раскладушку 3D. Гэтае мерапрыемства стала сапраўдным святам для ўсіх, хто любіць прыгоды і актыўныя гульні.

**19 чэрвеня** юныя наведвальнікі філіяла "Шчучынская дзіцячая бібліятэка" з радасцю ўдзельнічалі ў некалькіх мерапрыемствах. На бібліялужцы "Летнія прыгоды разам з кнігай" яны пагрузіліся ў чытанне энцыклапедый, часопісаў і кніг, а таксама пагулялі ў настольныя гульні. У той жа

дзень бібліятэка запрасіла дзяцей са школьнага лагера "Тэрыторыя дзяцінства" на інтэлектуальную гульню "Хто самы эрудыраваны", дзе яны прадэманстравалі свае веды і справіліся з лагічнымі заданнямі. Таксама дзеці са школьнага лагера СШ №3 прынялі ўдзел у віктарыне "Хто самы кемлівы і разумны", разгадваючы шарады і ўдзельнічаючы ў конкурсах "Вясёлая матэматыка", "Знайдзі героя" і "Свет вакол нас".

**26 чэрвеня** ў філіяле «Шчучынская дзіцячая бібліятэка» для дзяцей з аздараўленчага лагера «Тэрыторыя дзяцінства» прайшла гадзіна перыёдыкі «Прэса на ўсе інтарэсы». Дзецям патлумачылі, што такое перыядычныя выданні і ў чым адрозненне газеты ад часопіса. Асаблівую ўвагу надалі газеце "Зорка", якая адзначае сёлета 80-гадовы юбілей. Дзеці даведаліся пра навіны і самыя цікавыя рубрыкі!

## Павышэнне прафесійнага майстэрства

**11 красавіка** супрацоўнікі аддзела фарміравання бібліятэчнага фонду Шчучынскай раённай бібліятэкі ім. Цёткі правялі школу прафесійнага майстэрства на тэму “Актуальныя пытанні ў рабоце з бібліятэчным фондам”. Абмяркоўваліся пытанні камплектавання, вядзення дакументацыі па ўліку паступленняў і выбыцця, размяшчэння фонду пры адкрытым доступе, а таксама арганізацыі і выкарыстанні бібліятэчных рэсурсаў. Удзельнікам былі дадзены рэкамендацыі па

папулярызацыі інфармацыйных рэсурсаў, асабліва сацыяльна значнай літаратуры.

**17 красавіка** для супрацоўнікаў ДУК “Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі” прайшоў адзіны дзень інфармавання. Удзельнікі пазнаёміліся з прэзентацыяй “Подзвігу народа жыць у вяках. Да 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне». Быў прагледжаны дакументальны фільм «Генацыд: без права на забыццё». Абмяркоўваючы меры супрацьдзеяння экстрэмізму і тэрарызму, акцэнтавалі ўвагу на рэабілітацыі нацызму і прыкметах уцягвання моладзі ў дэструктыўную дзейнасць праварадыкальных груповак. Таксама закранулі тэму прафілактыкі хатняга гвалту. Важна быць пільнымі і інфармаванымі!

Спецыялісты ДУ "Нацыянальная бібліятэка Беларусі" і ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага" ў рамках абласнога семінара "Папулярызацыя кнігі і чытання: эфектыўныя шляхі і сучасныя падыходы" наведалі філіял «Шчучынская дзіцячая бібліятэка». Загадчык філіяла падзялілася ключавымі вектарамі развіцця, якія робяць бібліятэку прывабнай і даступнай для дзяцей, спрыяючы іх цікавасці да чытання і кніг, давяла, што бібліятэка - гэта сапраўдная тэрыторыя дзяцінства.



**23 мая** для супрацоўнікаў бібліятэк ДУК "Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі" прайшоў раённы

семінар-практыкум на тэму "Бібліятэка — цэнтр камфортнага чытання і вольнага часу". Падчас мерапрыемства ўдзельнікі наведалі філіял “Шчучынская дзіцячая бібліятэка” і прынялі ўдзел у пешай тэматычнай лекцыі па горадзе. Таксама бібліятэкары вывучылі праектны вопыт ДУК "Мастоўская раённая бібліятэка", з якім анлайн выступіла Коршун Вольга Анатольеўна.

Бібліятэкар аддзела
бібліятэчнага маркетынгу А.С. Бочка